

Жыве Беларусь!

Народная Газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№55 (1072) 23 сакавіка 1995 г. Чацвер. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 558399 экз. Кошт у розніцу — 150 руб.

Ліст з рэдакцыі

Няма Сярэдзіча, няма Галко...

З пятніцы, 17 сакавіка, рэдакцыя "Народнай газеты" працуе без галоўнага рэдактара. Іосіф Сярэдзіч, як вядома, адхілены ад пасады Прэзідэнтам, а Мікалай Галко, які, паводле чутак, будзе новым кіраўніком газеты, — яшчэ не прызначаны. Ні Прэзідэнтам, які фармальна не мае права прызначаць галоўнага рэдактара парламенцкай газеты, ні Вярхоўным Саветам, якога, здаецца, лёс уласнага выдання не надта хвалюе.

Учора ў рэдакцыі адбыўся сход калектыву, які даручыў падпісваць "Народную газету" першаму намесніку галоўнага рэдактара Казловічу А.М.

ЗВАРОТ

калектыву рэдакцыі "Народнай газеты" да Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

У мэтах стабілізацыі становішча ў рэдакцыі і захавання кіруемасці калектывам настойліва просім даручыць часова выконваць абавязкі галоўнага рэдактара "Народнай газеты" першаму намесніку галоўнага рэдактара Казловічу Анатолю Мікалаевічу, што вынікае са статута рэдакцыі і Закона аб друку.

Прынята на агульным сходзе аднагалосна.

22 сакавіка 1995 года.

На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Ордэн Маці ў Беларусі ёсць. Без узнагароды застаўся бацька

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

Вулкан пад назвай "парламент" хоць і пасыпаны попелам, але не ўтаймаваўся. Раз за разам з яго нетраў вырываюцца слупы агню, скіраваныя ўсё ў тым жа напрамку. "Толькі ў тых краінах, дзе рыхтуецца дыктатура, знішчаюць парламенцкую ўладу", "Прэзідэнту не патрэбен ні гэты Вярхоўны Савет, ні наступны", "Уся ўлада цалкам пераходзіць да "вертыкальшчыкаў". Так гаварылі дэпутаты Мікалай Крыжаноўскі, Віктар Аламліеў, Лявонцій Зданевіч.

Старшыня Цэнтрвыбаркама Аляксандр Абрамовіч, па прапанове Генадзя Карпенкі, даў неабходную інфармацыю аб ходзе перадвыбарнай кампаніі і сказаў, што выдаткаваныя 68 мільярдаў рублёў на рахунак Цэнтрвыбаркама так і не прыйшлі, а іх трэба яшчэ і праіндэксаваць з улікам інфляцыі. Ён пазнаёміў дэпутатаў і з такой трывожнай навіной: члены некаторых акруговых камісій з-за адсутнасці сродкаў збіраюцца абвясціць аб самароспуску. У выніку падчас дыскусіі прагучаў нават такі вывад: калі выбары не хоча фінансаваць дзяржава, іх прафінансуюць крымінальныя структуры і мы атрымаем ужо цалкам крымінальнае грамадства.

Станіслаў Шушкевіч спасылаўся на Прэзідэнта, які казаў, што грошы на выбары ён знайшоў. І задаваўся рытарычным пытаннем: "Не дзяржава, не падаткаплацельшчыкі, а менавіта ён?" У выніку паартыкульнага галасавання законапраекта аб выбарах прайшла толькі тая частка, якая пазбаўляе зарплаты даверaных асоб кандыдатаў у дэпутаты.

Пасля першага перапынку дэпутаты паспрабавалі паставіць кропку пад законапраектам аб дзяржаўных узнагародах. Зацвердзілі званне "Герой Беларусі", зацвердзілі ордэн Кастуся Каліноўскага, замест медаля "Адраджэнне" прынялі медаль Францыска Скарыны, зацвердзілі для жанчын, якія нарадзілі і выхавалі альбо ўсынавілі і выхавалі пяць і больш дзяцей, ордэн Маці. А вось з ганаровымі званнямі "народны" і "заслужаны" раптам атрымалася затрымка. Падчас дыскусіі аб тым, хто і за што варты гонару быць заслужаным альбо народным, слова ўзяў Уладзімір Станкевіч і прапанаваў увогуле адмовіцца ад гэтай "спадчыны". Яго падтрымаў Уладзімір Заблоцкі, нагадаўшы былыя прапановы Ніла Гілевіча. Артыкул большасці галасоў не атрымаў, але і зусім зняты не быў, а адправіўся на дапрацоўку.

Да справы галоўнага рэдактара "НГ" Іосіфа Сярэдзіча да абедзеннага перапынку дэпутаты так і не вярнуліся. Паводле слоў Мечыслава Грыба, новы праект пастановы да яго не паступаў. Як толькі ён з'явіцца, старшыня гатовы паставіць пытанне на абмеркаванне.

Универмагом больше, супермаркетом меньше?

21 марта в Национальном пресс-центре Республики Беларусь состоялась пресс-конференция "О национализации Торгового дома "На Немиге".

СП "РоденМинск", использующий сегодня торговые площади универмага, попыталось таким образом привлечь внимание журналистов к затянувшемуся спору о праве на эксплуатацию Торгового дома.

Нынешний Торговый дом "На Немиге" был спроектирован еще в советское время как огромный торговый центр "Детский мир". Однако к середине 1991 года стало ясно, что у города нет средств для полной реализации этого проекта. Тогда-то и возникло СП, которое помогло завершить начатое строительство. Строительные работы было решено вести совместно, но возник спор: кто же будет эксплуатировать помещение. Письмо председателя Мингорисполкома В.Ермошина, датированное 20 февраля 1995 года, предписывает передать его на баланс ЖРЭО Центрального района. Свое решение по этому вопросу вынесет Высший хозяйственный суд. Но существует мнение, что при национализации Торгового дома "На Немиге" город сможет получить еще один универмаг, но потеряет перспективный супермаркет.

Александр КАЗАК.

Правительство утверждает, что есть возможность обуздать цены. Как скоро она превратится в реальность?

Вчера состоялось республиканское совещание по проблемам промышленности и топливно-энергетического комплекса.

В нем приняли участие руководители министерств, ведомств, предприятий, ученые, предприниматели — всего более восьмисот человек. С докладом выступил заместитель премьер-министра Валерий Кокорев. Он отметил, что экономическая ситуация в республике по-прежнему сложная, но в последнее время наметились некоторые позитивные сдвиги. Лучше других работает нефтехимическая отрасль. Есть значительные трудности в машиностроении. В тяжелой ситуации легкая промышленность.

На совещании отмечалось, что мы "наломали дров" в ценообразовании, но есть возможность стабилизации цен. Имеется ряд злоупотреблений среди руководителей предприятий. Некоторым руководителям, которые не справляются с ситуацией и не умеют творчески работать, было предложено подумать и добровольно покинуть свои посты. Высказывались жалобы на торговлю, которая не возвращает вовремя деньги. Присутствующий на заседании Президент Республики Беларусь Александр Лукашенко пообещал в самое ближайшее время разобраться с этой проблемой.

Владимир БОРИСОВ.

Вкратце

Президент Республики Крым Юрий Мешков обратился к руководству России по поводу неправомерности действий Верховного Совета Украины в отношении Крыма, которые, по его словам, "расцениваются как насильственные, направленные на постепенную ликвидацию основ государственности, о чем свидетельствуют митинги и собрания граждан в населенных пунктах".

❑

Командование объединенными силами федеральных войск в Чечне назвало "не соответствующими действительности" сообщения ряда средств массовой информации о якобы имевших место крупных потерях среди личного состава российских подразделений, понесенных в ходе операции по блокированию чеченских сил в районе города Аргун.

❑

Госдума не поддержала в среду предложение депутата Юлия Рыбакова (фракция "Выбор России") в законодательном порядке запретить ведение боевых действий в Чечне.

Это предложение поддержали лишь 158 депутатов при минимуме для принятия решения в 226 голосов.

❑

Курс российского рубля по отношению к доллару США на торгах Московской межбанковской валютной биржи в среду упал на 17 пунктов до 4841 рубля.

❑

Экипаж 17-й экспедиции на российский орбитальный комплекс "Мир" совершил успешную посадку в среду в 7.03 утра по московскому времени северо-восточнее города Аркалык (Казахстан).

В составе экипажа три космонавта: Валерий Поляков - 437 суток в космосе — дольше, чем любой из жителей Земли, Елена Кондакова — "женский" рекорд пребывания на орбите — 168 суток, Александр Викторенко — 168 суток на орбите.

❑

Председателем парламента Эстонии восьмого созыва во вторник избран Тоомас Сави. За нового спикера проголосовали 52 из 100 присутствующих на первом заседании сессии депутатов (всего в парламенте 101 депутат).

Кто поджигал себя на площади

Как стало известно агентству РИД, Министерство внутренних дел Беларуси установило личность человека, предпринявшего 20 марта попытку самосожжения на площади Независимости перед Домом правительства.

Им является житель деревни Великая Слива Слуцкого района Минской области Самусевич Семен Макарович. По сообщению министра внутренних дел Юрия Захаренко, 62-летний пенсионер является инвалидом II группы с 1985 года с диагнозом дебилизм с манией преследования и манией величия. На месте попытки суицида обнаружен плакат следующего содержания: "Господин Президент. Я вам верю и стараюсь помочь в наведении порядка. Прошу вас, примите меня на 2 минуты. Я охарактеризую положение в Слуцком районе. Если вы меня не захотите принять, мне больше ничего не остается делать, как спалить себя на площади Незалежнасці, бо мне нет больше возможности оставаться на этом свете".

Владимир ГОЛОВКО.

Березина принимает первые жертвы

Едва освободившись ото льда, Березина унесла несколько человеческих жизней.

Сначала трагически закончилась попытка 18-летнего юноши "открыть" купальный сезон в районе светлогорского городского пляжа. А в одну из ненастных ночей в районе деревни Якимова Слобода несчастьем обернулась для двух человек рыбалка. Оба они утонули, причем тело одного из них до сих пор не найдено.

Николай ПОСЕДЬКО.

"... Мы разам павінны быць адказнымі перад кожным грамадзянінам Беларусі"

Выступленне Прэзідэнта А.Лукашэнкі на сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 21 сакавіка 1995 г.

Паважаныя дэпутаты Вярхоўнага Савета!

Заканчваецца тэрмін вашых паўнамоцтваў, таму я вырашыў выкарыстаць сваё права выступіць, магчыма, у апошні раз перад Вярхоўным Саветам. У адрозненне ад маіх папярэдніх зваротаў да вас я, як Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, хацеў бы падвесці некаторыя вынікі нашай сумеснай работы са жніўня 1994 года, гэта значыць з таго моманту, калі Прэзідэнт Рэспублікі прынёс прысягу і пачаў выкананне сваіх абавязкаў. Гэта важна яшчэ і таму, што Прэзідэнта часта папракаюць у тым, што ён ідзе на канфрантацыю з Вярхоўным Саветам. Прайшло ўжо дастаткова часу, і ёсць магчымасць ва ўсім разабрацца і зрабіць пэўныя вывады. Таму я хацеў бы выдзеліць шэраг ключавых момантаў ва ўзаемадзеянні Вярхоўнага Савета і Прэзідэнта, ад якіх залежаць гарантыі палітычнай стабільнасці ў нашым грамадстве, дынаміка выканання антыкрызісных мер у эканоміцы і працэс фарміравання новай заканадаўчай улады ў рэспубліцы. Я неаднаразова заклікаў Вярхоўны Савет да супрацоўніцтва ў гэтых пытаннях, аднак мае прапановы часта не ўспрымаліся вамі.

1. Спынюся на характары ўзнікшых адносін Прэзідэнта і Вярхоўнага Савета перш за ўсё ў галіне дзяржаўнага будаўніцтва, паколькі менавіта ў гэтай жыццёва важнай сферы ў большай меры выяўляюцца прыметы дэфармацыі канстытуцыйнага балансу галін улады.

15 сакавіка 1994 года Вярхоўны Савет прыняў новую Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Канстытуцыя вызначыла нашу краіну як унітарную, дэмакратычную, сацыяльную і прававую дзяржаву. Беларусь па Канстытуцыі стала прэзідэнцкай рэспублікай, заснаванай на прынцыпах поўнаўладдзя народа, раздзялення ўлад на заканадаўчую, выканаўчую і судовую, прыярытэту правоў і інтарэсаў асобы перад інтарэсамі дзяржавы.

Прайшоў ужо год пасля прыняцця новай Канстытуцыі. За гэты час быў уведзены інстытут прэзідэнцтва і адбыліся дэмакратычныя выбары першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, сфарміраваны новы ўрад — Кабінет Міністраў, практычна закончана ўтварэнне так званай "прэзідэнцкай вертыкалі", гэта значыць сістэмы выканаўча-распарадчых органаў на месцах, створаны органы, якія забяспечваюць дзейнасць Прэзідэнта, такія як Савет Бяспекі, адміністрацыя Прэзідэнта і іншыя. Такім чынам, працэс дзяржаўнага будаўніцтва, звязаны з пераходам ад парламенцкай рэспублікі да рэспублікі прэзідэнцкага тыпу, па сутнасці, завяршаецца. Няма сумненняў у тым, што гэты працэс праходзіў не заўсёды гладка. Пераўтварэнні ў галіне дзяржаўнага будаўніцтва яшчэ не сталі важным фактарам у рэалізацыі эканамічнай, палітычнай і сацыяльнай праграмы Прэзідэнта, паколькі не заўсёды зладжана дзейнічае сістэма выканаўчай улады як у цэнтры, так і на месцах. Мы бачым гэтыя недахопы і прымаем меры па іх ліквідацыі. Разам з тым адной з важнейшых умоў для эфектыўных пераўтварэнняў у галіне дзяржаўнага будаўніцтва з'яўляецца характар узаемаадносін паміж заканадаўчай і выканаўчай уладай, паміж Вярхоўным Саветам, Прэзідэнтам і Кабінетам Міністраў.

Як Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, я разумею, што ў перыяд рэалізацыі новых прынцыпаў узаемаадносін паміж рознымі галінамі дзяржаўнай улады магчымы пэўныя супярэчнасці, звязаныя з удакладненнем месца таго ці іншага інстытута дзяржаўнай улады ў агульнай сістэме дзяржаўных органаў, вызначэннем форм іх узаемадзеяння, устанаўленнем прыярытэтаў у рэалізацыі паўнамоцтваў рознымі органамі дзяржаўнай улады. Аб'ектыўна існаванне такіх супярэчнасцей звязана са змяненнем формы дзяржаўнай будовы і заменай парламенцкай рэспублікі прэзідэнцкай, розным разуменнем норм новай Канстытуцыі, якія вызначаюць прававы статус Прэзідэнта, Вярхоўнага Савета і іншых дзяржаўных органаў.

Хачу нагадаць, што па раней дзеючай Канстытуцыі народаўладдзе ажыццяўлялася ў асноўным праз сістэму Саветаў дэпутатаў, а Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, з'яўляючыся вышэйшым органам дзяржаўнай улады, меў права на падставе 97-га артыкула Канстытуцыі 1978 года разглядзець і вырашыць любое пытанне, якое адносіцца да вядання рэспублікі. Усе астатнія дзяржаўныя органы былі падкантрольныя ці падсправаздачныя Саветам народных дэпутатаў. Вярхоўны Савет фарміраваў Савет Міністраў — вышэйшы выканаўчы і распарадчы орган, іншыя вышэйшыя дзяржаўныя органы — Вярхоўны суд, Вышэйшы гаспадарчы суд, назначаў Генеральнага пракурора, старшыню Кантрольнай палаты. Мясцовыя Саветы народных дэпутатаў утваралі выканаўчыя і распарадчыя органы, выбіралі суддзяў гарадскіх і раённых народных судоў і г.д. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года ўстанавіла іншы падыход да характару ўзаемаадносін паміж дзяржаўнымі органамі, пабудаваны на прынцыпе раздзялення ўлад, у рамках якога ўсе дзяржаўныя органы ў межах сваіх паўнамоцтваў самастойныя, стрымліваюць і ўраўнаважваюць адзін аднаго. Я спецыяльна звярнуў вашу ўвагу, паважаныя дэпутаты Вярхоўнага Савета, на параўнанне палажэнняў старой і новай Канстытуцыі. Справа ў тым, што пры вызначэнні новага парадку ва ўзаемадзеянні дзяржаўных органаў між імі магчымы спрэчкі аб кампетэнцыі, характары і формах іх адносін, механізме вырашэння канфліктаў. Ёсць і іншыя прычыны, чыста суб'ектыўнага характару. Для вас не сакрэт, што пры распрацоўцы Канстытуцыі, і ў прыватнасці пры вызначэнні такой формы дзяржаўнай будовы, як прэзідэнцкая рэспубліка, Вярхоўны Савет арыентаваўся на канкрэтную кандыдатуру на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У многім пад гэту кандыдатуру і была падрыхтавана глава 4 Канстытуцыі, якая вызначае прававы статус і кампетэнцыю Прэзідэнта. Аднак той Прэзідэнт, які быў запраграміраваны большасцю цяперашняга саставу Вярхоўнага Савета, не быў выбраны. На выбарах народ выказаў іншую думку, і гэта яго безумоўнае права, якое абавязаны паважаць усе структуры дзяржаўнай улады, палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні пры ўмове, калі існуе шчырая воля ўстанаўлення ў Беларусі сапраўды дэмакратычных традыцый, дзе думкі большасці і кожнага грамадзяніна вышэй за ўсё. Аднак непахісны, я сказаў бы, — дзяржаўны суб'ектывізм многіх дэпутатаў, які склаўся яшчэ ў час прыняцця Канстытуцыі, да гэтага часу захаваўся і, на жаль, выступае асновай многіх не заўсёды выверaных дзеянняў Вярхоўнага Савета.

Я не хацеў бы цяпер аналізаваць змест выступленняў асобных дэпутатаў Вярхоўнага Савета, якія датычаць як Прэзідэнта, так і службовых асоб Кабінета Міністраў, адміністрацыі, кіраўніцтва спраў. Разам з тым не магу не адзначыць, што шэраг выступленняў дэпутатаў Вярхоўнага Савета адносна ўказаных асоб часта носіць зневажальны характар, далёкі ад канструктыўнай крытыкі. Але гэта пытанне этыкі паводзін некаторых дэпутатаў, і я не буду на ім спыняцца, а хацеў бы звярнуць вашу ўвагу на наступнае. Перш за ўсё, пытанне захавання этычных норм, я нават сказаў бы — простай чалавечай маралі ў паводзінах асобных дэпутатаў, непасрэдна звязана з маральнасцю Вярхоўнага Савета як вышэйшага заканадаўчага органа дзяржавы. І гэту прамую ўзаемасувязь нельга не заўважыць асабліва ў апошні час. У выступленні па Закону "Аб Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь" мной ужо ўказвалася, што ў заключнай стадыі сваёй работы дэпутаты вызначылі для сябе гарантыі, несувымерныя з узроўнем сацыяльнай абароненасці ўсяго народа Беларусі. Тыя папраўкі, якія былі затым унесены ў Закон аб Вярхоўным Савеце пасля выступлення Прэзідэнта, істотна не змянілі аб'ём і характар дэпутацкіх ільгот. У гэтай сувязі прапаную дэпутатам Вярхоўнага Савета падумаць таксама і аб іншым. Як вы добра памятаеце, у кастрычніку 1993 года Вярхоўны Савет прыняў Заяву "Аб неабходнасці паскарэння канстытуцыйных пераўтварэнняў у Рэспубліцы Беларусь". Ва ўказанай заяве Вярхоўны Савет адзначаў, я цытую: "Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь бачыць сваёй галоўнай задачай прыняцце не пазней за 1993 год Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Рэспублікі Беларусь і правядзенне ў сакавіку 1994 года выбараў у новы вышэйшы орган дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь".

Прыводжу вам яшчэ адзін дакумент — Заяву Прэзідыума Вярхоўнага Савета, на гэты раз ад 11 лютага 1994 года. Зноў цытую: "Прэзідыум Вярхоўнага Савета лічыць, што, не стварыўшы неабходнай прававой базы, не прыняўшы законы аб дзяржаўнай будове, аб выбарах кіраўніка дзяржавы і выканаўчай улады, праводзіць новыя выбары ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь нельга. Іншы шлях прывядзе да хаосу і развалу дзяржавы. Прэзідыум Вярхоўнага Савета заяўляе аб сваёй цвёрдай рашучасці дабіцца на бягучай сесіі (г.зн. на трынаццатай) падтрымкі народнымі дэпутатамі прапанаваных мер па ўмацаванню дысцыпліны, парадку і законнасці, ажыццяўленню рэформ у сферы дзяржаўнага будаўніцтва, прыняцця новай Канстытуцыі, правядзення ў першым паўгоддзі 1994 года ўсенародных выбараў кіраўніка дзяржавы і выканаўчай улады" — і далей падкрэсліваю, — "у другім паўгоддзі — выбараў у Вярхоўны Савет, а ў сакавіку 1995 года — выбараў у мясцовыя Саветы народных дэпутатаў. Тым самым будуць забяспечаны на аснове законаў пераемнасць улады і стабільнасць у грамадстве, удзел усяго насельніцтва ў абнаўленні дзяржаўных органаў".

Я свядома прывёў гэтыя доўгія цытаты з заяў Вярхоўнага Савета і яго Прэзідыума. Што ж атрымалася ў выніку гэтых заяў? Нічога. Выбары ў Вярхоўны Савет не былі праведзены ні ў сакавіку 1994 года, ні ў другім паўгоддзі 1994 года. Выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў таксама не былі назначаны на сакавік 1995 года. Уся бяда ў тым, што, прымаючы ўказаныя заявы, і дэпутаты, і члены Прэзідыума Вярхоўнага Савета не думалі аб маральнай адказнасці за іх рэалізацыю. Аднак і гэта не галоўнае, хоць на гэтым пытанні я пазней спынюся.

Галоўнымі пытаннямі ўзаемаадносін паміж Вярхоўным Саветам і Прэзідэнтам у апошні час сталі працэсы пабудовы на аснове новай Канстытуцыі сістэмы органаў улады і кіравання як у цэнтры, так і на месцах, а таксама рэалізацыі асноўных палажэнняў Праграмы па выхаду эканомікі Рэспублікі Беларусь з крызісу.

Гаворачы аб першым блоку пытанняў, вымушаны адзначыць, што ў прынятых у апошні час законах "Аб Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь", "Аб Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь", "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь" зроблена спроба парушыць баланс улад, замацаваны ў Канстытуцыі. Так, напрыклад, у Законе "Аб Вярхоўным Савеце" ёсць шэраг норм, якія абмяжоўваюць правы выканаўчай улады і ў пэўнай меры не адпавядаюць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Да іх адносяцца нормы, што вызначаюць кампетэнцыю Вярхоўнага Савета (артыкул 9 Закона), паўнамоцтвы Вярхоўнага Савета адносна ўласнасці (артыкул 10), абавязковую сілу пастаноў Вярхоўнага Савета без устанаўлення кола пытанняў, па якіх яны прымаюцца (артыкул 54). Павінен заўважыць, што шэраг палажэнняў Закона "Аб Вярхоўным Савеце", якія супярэчаць Канстытуцыі, ліквідаваны самім Вярхоўным Саветам пры прыняцці Закона "Аб унясенні змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь". Аднак склалася парадаксальная сітуацыя: спачатку Вярхоўны Савет кваліфікаванай большасцю галасоў адхіліў усе папраўкі Прэзідэнта да Закона "Аб Вярхоўным Савеце", а потым, пасля ўступлення закона ў сілу, многія прапановы Прэзідэнта ў той або іншай рэдакцыі былі ўсё-такі часткова ўлічаны. Ці дапушчальная такая лёгкасць у заканатворчай дзейнасці вышэйшага заканадаўчага органа дзяржавы, які павінен, здавалася б, быць узорам бескарыслівага служэння свайму народу?

Адначасова з неабгрунтаваным павелічэннем сваіх паўнамоцтваў, расшырэннем правоў і льгот дэпутатаў Вярхоўны Савет у Законе "Аб Прэзідэнце" зрабіў спробы абмежаваць паўнамоцтвы Прэзідэнта ў частцы выдання нарматыўных актаў па пытаннях арганізацыі і дзейнасці выканаўчай улады, стварэння рабочых органаў пры Прэзідэнце і вызначэння іх кампетэнцыі. Таксама выклікае неўразуменне жаданне Вярхоўнага Савета замацаваць у Законе "Аб Прэзідэнце" палажэнне аб тым, што ў выпадку часовага невыканання Прэзідэнтам сваіх абавязкаў па стану здароўя паўнамоцтвы Прэзідэнта пераходзяць да Старшыні Вярхоўнага Савета.

Яшчэ больш незразумелая пазіцыя Вярхоўнага Савета ў сувязі з унясеннем змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь". На падставе заключэння Канстытуцыйнага суда ўказаным законам быў адноўлены пярвічны ўзровень мясцовых Саветаў дэпутатаў. Аднак пры гэтым быў зменены асноўны прынцып Закона аб мясцовым кіраванні і самакіраванні — прынцып раздзялення на мясцовым узроўні функцый прадстаўнічай, выканаўчай і судовай улад. Папраўкай да артыкула 11 Закона аб мясцовым кіраванні і самакіраванні былі аб'яднаны пасады старшыні Савета і старшыні выканкама на пярвічным тэрытарыяльным узроўні. Такім чынам, папраўка да артыкула 11 Закона "Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь", па-першае, не адпавядае прынцыпу раздзялення прадстаўнічай, выканаўчай і судовай улад; па-другое, змяняе парадак назначэння кіраўнікоў выканаўчых камітэтаў пярвічнага ўзроўню і тым самым супярэчыць прынцыпу адзінства і цэласнасці сістэмы мясцовага кіравання і самакіравання.

Я не буду больш спыняцца на законах, прынятых Вярхоўным Саветам у галіне дзяржаўнага будаўніцтва. Асобныя з іх не адпавядаюць Канстытуцыі, напрыклад, Закон Рэспублікі Беларусь "Аб суадносінах актаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, якія маюць юрыдычныя вынікі", у прыватнасці ў сферы прызнання аднолькавай юрыдычнай сілы за законамі і пастановамі Вярхоўнага Савета, іншыя наўрад ці могуць быць выкананы з-за адсутнасці сродкаў для іх рэалізацыі. У апошнім выпадку размова ідзе аб шэрагу заканадаўчых актаў, якія вызначаюць дадатковыя гарантыі для розных катэгорый насельніцтва: гэта законы "Аб Вярхоўным Савеце", "Аб унясенні змяненняў у Закон аб асновах службы ў дзяржаўным апараце", "Аб унясенні змяненняў у Законы аб Пракуратуры і Канстытуцыйным судзе", "Аб судовым ладзе і статусе суддзяў" і многія іншыя.

Узнікае заканамернае пытанне: чаму так складана ідзе працэс дзяржаўнага будаўніцтва ў нас у рэспубліцы, нягледзячы на тое, што прынята новая Канстытуцыя Беларусі?

Па-першае, як мне ўяўляецца, Вярхоўны Савет страціў часовыя арыенціры ў сваёй працяглай і не заўсёды паслядоўнай дзейнасці. Выбраны яшчэ ў камуністычную, саюзную эпоху і адначасова пахаваўшы яе, ён апынуўся сам-насам з вельмі цяжкай праблемай будаўніцтва ўласнай дзяржавы. Балансуючы ў складанай павуціне вырашэння дзяржаўных, палітыка-эканамічных і сацыяльных пытанняў, ён аказаўся не заўсёды гатовым да вызначэння галоўных і другарадных задач. У выніку гэтага спакуса дзяржаўнага эгаізму асабліва відавочна праявілася на фінішным этапе работы Вярхоўнага Савета.

Па-другое, прыняцце ў спешным парадку Канстытуцыі, Асноўнага Закона Рэспублікі Беларусь, не шляхам рэферэндуму, а самім Вярхоўным Саветам выклікала ў дэпутатаў адчуванне сваіх неабмежаваных магчымасцей. Адсюль праблема магчымага замаху на Канстытуцыю з боку самога Вярхоўнага Савета ўзнікла ў дзень яе прыняцця.

І па-трэцяе, да завяршэння сваіх паўнамоцтваў Вярхоўны Савет падышоў у вельмі разбалансаваным стане. У гэтым ёсць і аб'ектыўныя, і суб'ектыўныя прычыны. Далёка не ўсе дэпутаты змаглі вытрымаць пяцігадовы марафон з высокім пачуццём адказнасці за лёс народа Беларусі. Пастаянна паўпустая зала пасяджэнняў Вярхоўнага Савета — аб'ектыўны паказчык дзеяздольнасці і маральнага патэнцыялу дэпутацкага корпуса на завяршальным этапе сваёй работы.

Пры вырашэнні важных і складаных дзяржаўных пытанняў, каб забяспечыць кворум, дэпутаты галасуюць адзін за аднаго, не задумваючыся аб маральным боку такой легкадумнасці ў заканатворчасці. Ёсць і юрыдычны бок гэтага пытання. Галасуючы за адсутных, дэпутаты парушаюць артыкул 84 Канстытуцыі, які прадугледжвае абавязак асабістага галасавання. У такіх умовах дэзарганізаванасці я пачалавечы разумею тых дэпутатаў, якія з этычных, відаць, меркаванняў наогул перасталі наведваць пасяджэнні Вярхоўнага Савета і заняліся сваёй звычайнай работай на вытворчасці.

2. Узаемаадносіны Вярхоўнага Савета з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у галіне дзяржаўнага будаўніцтва не могуць не адбівацца на іх узаемадзеянні ў сферы вырашэння важнейшай эканамічнай праблемы — выхаду рэспублікі з крызісу.

Я думаю, дэпутаты разумеюць, што ў вырашэнні эканамічных і сацыяльных пытанняў мы знаходзімся на хісткім, вельмі тонкім лёдзе. Пры неймаверных намаганнях у пабудове правільнай палітыкі з Расіяй, дзе асноўныя нашы энерганосьбіты, нам удалося без асаблівых страт перажыць зіму, стабілізаваць рубель, не дапусціць значнага спаду прамысловай вытворчасці і стварыць умовы для правядзення пасяўной кампаніі. Тэмпы, уся арганізацыя пасяўной — выключна важны этап у дасягненні больш трывалай стабілізацыі эканомікі на ўвесь бягучы і першую палавіну будучага года. Я сказаў бы, што гэта экзамен устойлівасці нашай дзяржавы, правільнасці выбранага курсу вываду рэспублікі з крызісу. Энергічнае правядзенне пасяўной кампаніі, канкрэтныя меры дзяржавы пасля абагравальнага сезона, калі настане паўгадавая паўза ў расходаванні буйных аб'ёмаў энергарэсурсаў, дадуць магчымасць стварыць базу для ўмацавання фінансавай і эканамічнай стабільнасці на бліжэйшую перспектыву. У рамках дасягнення такой стабільнасці мы разлічваем дабіцца парытэту цэн у сельскай гаспадарцы і за кошт гэтага пачаць змяненне інфраструктуры вёскі. Ва ўмовах рэальна дзеючых беларуска-расійскіх дагаворанасцей мы разлічваем на паступовае аздараўленне прамысловай вытворчасці за кошт ліквідацыі мытных падаткаў і пошлін, аднаўлення міжгаліновых і міжвытворчых сувязей з Расіяй, іншымі дзяржавамі СНД. Стабілізацыя, безумоўна, павінна быць не за кошт народа, а ў імя паляпшэння жыцця людзей. Менавіта таму Прэзідэнт і Кабінет Міністраў не маюць намеру неабгрунтавана павялічваць тэмпы пераходу да рынку за кошт згортвання сацыяльных праграм для насельніцтва, і перш за ўсё — шматлікіх груп пенсіянераў. Сацыяльная абарона грамадзян будзе мець адрасны характар і грунтавацца на спалучэнні стрымлівання цэн з боку дзяржавы і павышэння ўзроўню даходаў насельніцтва.

Ключавым фактарам, які вызначае прыярытэтныя напрамкі ў развіцці эканамічных адносін, з'яўляецца наяўнасць дастатковай заканадаўчай базы для сацыяльна арыентаваных эканамічных рэформ. За 5 гадоў сваёй дзейнасці Вярхоўны Савет прыняў няմала законаў і пастаноў, звязаных з рэгуляваннем эканамічных адносін. Аднак недахопам у рабоце Вярхоўнага Савета, на мой погляд, з'яўлялася адсутнасць паслядоўнай лініі, калі хочаце, асэнсаванай стратэгіі, накіраванай на ўпарадкаванне заканадаўства ў гэтай галіне. Прымаемыя законы і пастановы часта мелі супярэчлівы характар, не заўсёды ўвязваліся паміж сабой. У пэўнай меры пры падрыхтоўцы і абмеркаванні законапраектаў назіраўся не дзяржаўны падыход, а падыход кан'юнктурна-лабісцкі, звязаны з рэалізацыяй інтарэсаў асобных катэгорый насельніцтва, прадстаўленых дэпутатамі ў нашым парламенце. Недастатковай была і работа па кадыфікацыі грамадзянскага і гаспадарчага заканадаўства, падрыхтоўцы і прыняццю новых кодэксаў законаў (Грамадзянскага, Грамадзянска-працэсуальнага кодэксаў, Кодэкса законаў аб працы і іншых). Адсутнасць належнай заканадаўчай базы стрымлівала працэс развіцця новых эканамічных адносін рынчнага тыпу і з'явілася адной з прычын паглыблення эканамічнага крызісу.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Народная газета

СЛОВО ПИСАТЕЛЯ

В одну и ту же реку истории можно войти дважды. Беларусь уже входит

Карлос ШЕРМАН

Люди, что и говорить, разделены, разучились слушать оппонента, погрузились в раздраженную апатию, а страна мчится в пропасть нищеты. Кто-то высказывается на одном языке, кто-то перечит на другом, но никто никого не слушает. Странное свойство искусственной глухоты подпитывается стереотипами мышления, которые, увы, вводились десятилетиями. Идеологи хорошо поработали. Образ врага или патриота, героя или антигероя закостенел в сознании целых слоев общества. Это как месть за бренность идеологов — дескать, вы нас еще попомните.

Безусловно, я о людях, не тронутых политическими амбициями, но все же оказавшихся под мощным облучением монопольной идеологии. Политики в основном видят перед собой сверхзадачу: оказаться на вершине власти, ибо в их понимании власть выше богатства и любви, закона и морали, просто выше всего в жизни. Только смерть выше власти, но смерть — это потом, когда-нибудь, а пока есть власть... Другое дело — люди, не познавшие искушения властью и запутавшиеся в хитросплетениях идеологии, в липких сетях, расставленных прожженными политиками.

Кризис — это славное время для рыцарей прошлого, и вовсе не важно, какой знак они поднимают на своих скрижалях. Главное — они ведут в прошлое, а стало быть, вновь откладывают путь развития общества на неопределенное время.

Кризис — это великолепное время для демагога, который обычно выдвигается вдруг, не имея ни программы, ни собственной идеологии, но демагог без зазрения совести берет взаймы у прошлого то, что ему сиюминутно угодно, и усыпляет народ трогательными песнями о чести и беззаветной преданности до самого черного тупика, откуда не дано выбраться.

Так свидетельствует история человечества. Конечно, о ней политики стараются не вспоминать. Кто же любит пристальное зеркало собственных ошибок? Ярый сторонник тоталитарного прошлого с архипелагом ГУЛАГ за плечами? Поборник разваливающейся на глазах последней империи?

Все это было. Так стоит ли повторяться?

История представляет собой спираль с зыбкими подъемами и почти незаметными падениями, а всему виной — невостребованный с прежних времен опыт. Порой кажется, что страна встает с колен, когда на самом деле вновь падает по спирали. Отсюда и предостережение: как бы мы ни тешились иллюзиями о необратимости исторических процессов, надо откровенно признать: необратимых процессов нет, в одну и ту же реку истории можно войти дважды. Кстати, туда и тянут нас сегодня. В прошлое.

На поверхности общественной жизни как будто нет идеи, способной объединить народ. Люди всматриваются не в будущее, а только думают, как сегодня выжить. Однако — это на поверхности. Выход где-то глубже, заваленный обломками глухой стены непонимания, неприятия.

❑

Нас кормили с руки сказками о том, что народ-де не ошибается. Между тем при всей его вековой и, казалось бы, бесконечной мудрости ему противостоит целая наука о безусловном влиянии на его весомые решения. Компетентная команда по ведению предвыборной кампании незаметно меняет курс страны на многие годы. В посттоталитарном пространстве с неустоявшимися правовыми традициями тонкие, психологически выверенные методы чередуются с грубым попранием прав человека.

Вспомните якобы свободные выборы депутатов в парламент Беларуси, когда закрытое общество ощетинилось и даже каждый контакт оппозиции с избирателями мог превратиться в спровоцированную бойню, а одно присутствие на митинге рассматривалось как подвиг. Или первые президентские выборы, задолго до коих средства массовой информации были жестко взяты в государственный кулак.

Народ ошибается, не распознает своих апостолов.

Одна его часть ратует за национальное самосознание и возрождение, другая боится самосознания и возрождения, как черт ладана, даже страшат демократами, которые, видите ли, приверженцы насилия и заставят русских говорить по-белорусски.

Сегодня переподчинение и взятие средств массовой информации в государственный кулак практически повторилось, свободная пресса держится под неимоверным давлением. Скоро выборы. Кто на этот раз лучше обманет?

Обычно западные специалисты обманывают куда как проворнее, они ищут доходчивую, крылатую формулу, которая выражала бы одно заветное желание электората и при этом была бы симпатична, неопровержима и легко запоминаема. Это гвоздь программы, ось всей кампании. Аналитики, психологи, эксперты по рекламным акциям, подготовке речей и тактике ведения полемики, структуре поведения при якобы случайных встречах — буквально все прорабатывают раскрытие формулы до мелочей, даже изучают поведение соперников, их сильные и слабые места, возможность влияния на мышление их адептов, корректность ведения кампании со стороны властей предержащих. Таким образом создается эффект глубокой искренности. Иной вопрос — кому и чему служит такой эффект. Как раз об этом почти всегда люди задумываются поздно.

Словом, это наука, и в Беларуси она преимущественно подменяется интуицией, мозговыми атаками самих политиков, но не специалистов. В итоге предвыборные кампании проистекают довольно примитивно, малоинтересно, без широких дебатов в режиме прямого диалога и ярких впечатлений, они непривлекательны, и этим усугубляется их восприятие людьми как совершенно бесплодное занятие.

❑

В жизни неоспоримо лишь то, что нравственно. Если смотреть на проблему языка в Беларуси с этой точки зрения, то многое прояснится.

Опыт множества стран показывает, что к официальности, государственности языка люди относятся с естественной строгостью. Принципиально язык титульной нации и есть официальный, государственный язык. Родной язык, как и родную мать, не выбирают.

В мире есть малые по численности народы, но нет малых языков. Любой язык мудр и велик, в любом из них непременно найдутся уникальные выражения души, неповторимые оттенки, на каждом люди сосредоточенно повторяют: "Вначале было Слово..."

Некоторые языки получили обширное распространение, так как страна их происхождения была колониальной державой, однако это всего лишь количественный показатель. Величие языка не определяется количеством на нем говорящих. Спросите у гагауза, велик ли гагаузский язык, и по выражению лица, по радостному блеску глаз и вздоху счастья вы поймете, что любой иной язык, простите, в пятки ему не годится.

Известные зарубежные специалисты с мировым именем считают, что белорусский язык — один из богатейших в славянском мире, который сохранился в необычайной чистоте через нелегкие для его народа испытания, вопреки подавлению и прямому запрету, насильственному поглощению. Однако и без этой лестной характеристики нейтральных специалистов он равновелик, ибо при любых обстоятельствах является родным языком титульной нации.

С точки зрения нравственности защищать и уважать родной язык народа чище и естественнее, чем ратовать за искусственное введение не родного, хотя и более распространенного языка.

Двух матерей не бывает, как и двух родных языков. Владеть иностранными языками — признак просвещенности и культуры, пренебрегать родным — это как отказаться от матери. Вполне естественно, что нигде в мире язык обучения не выбирают. Самая малая этнокультурная община имеет право строить школу с помощью государства или даже получить здание, но в таком случае государственный язык преподается обязательно и в том же объеме, что и язык общины, иной подход невольно суживает права детей, ограничивает их возможности жить равноправно в будущем. Такова практика, и в ней заложена нравственность.

Остальное — политика, отражение определенных интересов в посттоталитарном обществе, ибо в нем часть населения живет под влиянием утраченных идеалов и надеется — имперское прошлое может вернуться.

В этой сложной ситуации все же справедливо признать, что введение родного языка не сопряжено с насилием, это всего лишь ломка внушенных представлений. В жизнь уже входят новые просвещенные поколения, для которых эта проблема — пройденный этап. Однако отход от активной жизни пожилых людей, переживших войну, лишения и страдания, которым свойственна идеализация прошлого, всегда болезнен и чреват конфликтами, но ведь от них никто и не требует особых усилий, кроме элементарного уважения к традициям, обычаям и языку белорусской нации. Эти правила действуют в любой стране мира. Тем не менее во все времена именно старшие поколения отвергали всякие реформы. Использовать ностальгические настроения, изрекать беспочвенные банальности о своем родном языке — безнравственно. Это — как поднять руку на собственную мать.

❑

Парадокс, но международные установления исходят из вполне нормальной ситуации, когда в стране имеется титульный язык, а также один или целый ряд языков меньшинств, сосуществование которых регулируется.

Так раньше попирались лингвистические права каталонцев, галисийцев и басков в Испании, где титульным языком по праву является кастильский, известный в мире как испанский. Так в разные времена страдало население колониальных владений от насильственного введения языка любой имперской державы. В таких условиях и отрабатывались механизмы регулирования.

Мы — аномалия, странное исключение, у нас язык титульной нации низведен до положения ущемленного в своих законных правах. Но речь не идет об аномалии природного происхождения. Все это сотворено правителями за довольно долгий период времени. Болезнь загнана вглубь, поэтому вопрос столь деликатен. Кто вдумчиво прочитал Закон о языках, тот понимает, что его положения гармонично сочетают интересы всех жителей Беларуси.

Сегодня многие напрочь забыли о самом содержании закона и порой требуют того, что в нем предусмотрено. Стало быть, нужна повторная публикация закона, и прежде всего на языке меньшинства. Компетентное и непредвзятое разъяснение круга белорусских вопросов на русском необходимо. На мой взгляд, оппозиция демократического толка самоограничивает себя тем, что распространяет свои мысли и ведет избирательную кампанию исключительно на белорусском. Немалая часть населения практически не ознакомлена с истинными намерениями этой оппозиции и просто шарахается от нее, ибо контрпропаганда с унизительным вкраплением белорусских слов в кавычках, как бы ни было обидно, сильна.

Дает о себе знать искаженное информационное пространство, в котором сотни газет и журналов, а также радио и телевидение находятся в руках государства и отражают официальное видение мира.

Недавно принят как будто демократический Закон о печати и других СМИ, но мне представляется, что известное соотношение сил в парламенте позволило издать лишь закон-маску, умело скрывающую ограничения прав и свобод. Нормальное уведомление о создании органа печати подменено строгим лицензированием с обязательной декларацией тематики и периодичности, а выход за рамки указанной тематики по обстоятельствам или невольное нарушение периодичности могут привести к закрытию издания.

Государство сохранило за собой право учреждать любые органы печати, хотя цивилизованный мир позволяет властям издавать лишь официальные акты и комментарии к ним. Этим фактически узаконена монополизация основных органов печати (около 400!) и СМИ. Не оговорена свобода критики властей и отдельных ее представителей. Критика необходима обществу и не должна рассматриваться как дифамация или ущемление чести и достоинства даже в тех случаях, когда она ошибочна. Не введены понятия умышленной дифамации и умышленного ущемления чести и достоинства, когда истец должен обосновать свои претензии к журналисту, неукоснительно соблюдая презумпцию невиновности.

Монополия порождает иллюзию насыщенности рынка, а на самом деле — информационный голод. Заполнить свободную нишу могла бы общедоступная газета всей демократической оппозиции, ведь небольшие газеты, признанные как независимые в своих суждениях, охватывают далеко не все информационное поле. В этом деле нет баланса сил, возможности для откровения и взаимовлияния. Население Беларуси, особенно вне столицы, явно обделено. Так взращиваются семена обмана, недоверия, конфронтации.

❑

Любое состояние общества требует выхода. Любой шаг есть причина следующего шага. Но довольно часто логика шагов скрыта от нас или непонятна. Шаг полон неожиданностей, а реакция на него обычно неизвестна, хотя древние философы в принципе подсказывали реальные варианты поведения.

В условиях демократии и ответственной свободы личности власть адаптируется к оппозиции, стремится к общественному согласию, способна на относительное взаимопонимание, умело идет на уступки, когда они неизбежны, и это отнюдь не мешает осуществлению собственного курса, а заметно расширяет базу поддержки. В иных условиях власть легко поддается соблазну конфронтации и вполне может сделать необдуманный шаг в сторону репрессий. Это все было, и общество избегает своего поражения только тогда, когда предвидит поведение личности, претендующей на власть.

Возникает вопрос: можно ли на самом деле предвидеть то, что неизвестно?

Можно, но для этого нужны благоприятные оговорки. Главные из них — стремление к осмыслению исторического опыта и полное право на независимую информацию. Тогда вероятность осознанного и адекватного предвидения велика. В противном случае остается лишь уповать на себя.

ГОСУДАРСТВО ПРОТИВ ЛИЧНОСТИ

Робинзоны в обитаемом городе

Олег ФОМЧЕНКО

Даже не верится, что эта глухая, сонная улочка находится чуть ли не в центре города. Несколько кирпичных коробок (будто после бомбежки). Деревянный, "выселенный", с закрытыми наглухо ставнями дом. Дальше еще такой же, давней постройки, но в нем до сих пор живут, из печной трубы идет дымок. Вокруг него — "кладбище" стройматериалов, заснеженные поленицы дров — итог каторжного труда обитателей этого тоже некогда "выселенного" дома. Дяди Саши и тети Насти для одних, а для других — Афанасьевича и Герасимовны.

Не часто бываю я здесь. Только когда случается от Дома книги подниматься на Юбилейную площадь или спускаться к проспекту Машерова. И почти всегда встречал Александра Афанасьевича за каким-то делом: с молотком, зубилом или пилой и лопаткой. На этой улочке, напоминающей съемочную площадку "Беларусьфильма", было приятно попить из колонки студено-криничной воды. Действует она и поныне, причем круглый год.

И вот на днях наведался сюда опять. Встретил Анастасию Герасимовну.

— Помер Афанасьевич, — сразу сказала она, — недавно. Так и не построили дом, — обвела рукой припасенные стройматериалы и вздохнула: — нечестные люди потихоньку растаскивают...

А у меня сжало горло. Так мы обстоятельно и не поговорили — то он, Александр Афанасьевич, занят, то я. Знал, что у него очень сложная и тяжкая судьба, что преследовался неоднократно за инакомыслие и правдоискательство; предполагал, что он юрист или историк, литератор.

Перед глазами встал высокий, все еще крепкий, с бородой, но очень и очень бледный, должно быть, от постоянного недоедания человек. Казалось, слышу его голос:

— Как и чем живу?.. Как божий человек. На буханку ржаного в день хватает, пока цена копеечная, а чай... Так вон колонка под боком...

Да, пока цены были сносные, на буханку хватало. А потом деньги, как шагреневая кожа, сжимались и сжимались.

Вспомнилась газетная заметка о том, что в минском кинотеатре "Москва" открыт — наконец-то! — первый мясной коммерческий ресторан "Стекхаус". Высококачественное мясо здесь готовится по специальным рецептам на гриле. И публика, конечно, изысканная — наконец-то дождалась...

Читаю: "В Стекхаусе" среднеевропейские цены, кухня уровня отелей "Интерконтиненталь". Самое дешевое блюдо из "вторых" порядка 6—7 долларов (по эквиваленту), а самое дорогое (не стек) — 40 ... Вдвоем можно отобедать или отужинать за 30—40 долларов". Всего-то!

А в нескольких сотнях метров от сытного "Стекхауса" с каждым новым повышением цен "усыхала" до микроскопических размеров краюха хлеба Афанасьевича...

— Собирали, собирали вот кирпич, жесть, прочие материалы, — сказала Анастасия Герасимовна, — да не быть дому... Разве таким, как мы, сейчас построиться!..

Да и у Анастасии Герасимовны судьба не из легких и простых. Не один десяток лет проработала, как она сказала, в службе быта. На этой же улочке, где, подобно бомжу, ютится она и сейчас, был ее дом — снесли его. Предлагали, правда, квартиру то ли на Западе, то ли на Юго-Западе, короче, у черта на куличках, но тут в ней "заговорила амбиция". Куда ехать, когда работа рядом, приходится ходить в несколько смен; да и зачем ехать, коли вон поблизости в полквартала многоэтажку возвели — неужто нельзя сколько-то метров ей выделить?!

Ну и завертелось колесо: несколько раз, с "применением силы", ее выселяли, вещи без нее перевозили, пока большая часть их не пропала, а она все здесь, как на подпорках, держится своей амбицией. Поддерживал сосед, такой же бедолага, Афанасьевич — только не стало его...

И никому нет дела до таких вот людей — Робинзонов в обитаемом городе. Даже Пятницы для них не находится.

Поздравил недавно с праздником давнюю знакомую, прошедшую девчонкой Великую Отечественную, освобождавшую Белоруссию. Всегда с благоговением гляжу на ордена, врученные ей на фронте, а не по случаю юбилеев и знаменательных дат. Вижу в глазах глубокую печаль. Понимаю: одиночество. Ведь сейчас-то из-за неимоверной дороговизны не то что встретиться однополчанам или родным, а просто поговорить "по межгороду", послать телеграмму, письмо — для большинства простых смертных непозволительная роскошь.

— Прежде хоть школьники заглядывали, а теперь на смену им новые поколения подрастают, с иной моралью, с новыми жизненными правилами: думай только о себе, своя рубашка ближе к телу, нахапаешь — будешь жить...

Горечь этих слов моей знакомой обжигает сердце.

Ну, а спонсорство, для кого оно? Вспоминается одно телевизионное шоу: толстяк-предприниматель в желтом пиджаке и полосатом галстуке, сетующий, что никак вот не удается открыть для обездоленных столовую с бесплатными обедами.

Зато легко проводятся песенные "Славянские базары", молодечненские и прочие шоу; зато видим на телеэкранах холеные лица добрых бизнесменов во время вручения дорогих призов, причем под "горячие аплодисменты" присутствующих.

Конечно, куда приятнее общество великих или почти великих композиторов, эстрадных звезд и поэтов-песенников, общество "народных" и "заслуженных"... Куда уж тут тем, кто влачит жалкое, нищенское существование!

А пока покидаю глухую, сонную улочку, которая почему-то уже напоминает не съемочную площадку киностудии, а театр под открытым небом, театр абсурда.

"... Мы разам павінны быць адказнымі перад кожным грамадзянінам Беларусі"

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як вы помніце, Прэзідэнтам была прапанавана Праграма неадкладных мер па выхаду эканомікі рэспублікі з крызісу. Гэта праграма была адобрана Вярхоўным Саветам, і былі зроблены першыя практычныя крокі па яе рэалізацыі. Праграмай прадугледжвалася прыняцце шэрага заканадаўчых актаў Вярхоўным Саветам, а таксама вырашэнне канкрэтных эканамічных пытанняў шляхам выдання актаў Прэзідэнта і рашэнняў Кабінета Міністраў.

Улічваючы неабходнасць аператыўнага рэгулявання эканамічных адносін, Прэзідэнт прапанаваў, каб да ўнясення адпаведных змяненняў і дапаўненняў у заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь, якія супярэчаць Канстытуцыі і палажэнням Праграмы неадкладных мер па выхаду эканомікі з крызісу, прымяняліся ўказы Прэзідэнта. Аднак Вярхоўны Савет гэту прапанову не падтрымаў, узяў на сябе адказнасць за падрыхтоўку адпаведных змяненняў, дапаўненняў у заканадаўчыя акты і такім чынам стаў на шлях тармажэння эканамічных пераўтварэнняў.

У снежні 1994 года Прэзідэнт зноў прапанаваў Вярхоўнаму Савету прыняць Закон "Аб прававым рэгуляванні эканамічных адносін у перыяд рэалізацыі Праграмы неадкладных мер па выхаду эканомікі Рэспублікі Беларусь з крызісу", у якім указвалася на магчымасць рэгулявання шэрага эканамічных праблем шляхам выдання ўказаў Прэзідэнта. Вярхоўны Савет праект такога закона не разгледзеў. Таму, хоць я і разумею заклапочанасць Старшыні Вярхоўнага Савета, звязаную з падрыхтоўкай заканадаўчых актаў, неабходных для рэалізацыі Праграмы, аднак павінен заўважыць, што Вярхоўны Савет, адхіліўшы прапановы Прэзідэнта, узяў на сябе абавязак падрыхтоўкі такіх заканадаўчых актаў. Больш таго, у адпаведнасці з новай Канстытуцыяй, значная частка дэпутатаў перайшла на прафесійную работу ў Вярхоўны Савет. Здавалася б, пасля гэтага камісія Вярхоўнага Савета актывізуе сваю работу па падрыхтоўцы неабходных заканадаўчых актаў, але гэтага не адбылося. Камісіі па-ранейшаму перакладваюць гэтую работу на Прэзідэнта і Кабінет Міністраў, хоць усе магчымасці па падрыхтоўцы законаў і пастаноў у іх ёсць. У Вярхоўным Савеце акрамя дэпутатаў, што працуюць на прафесійнай аснове, ёсць і дастаткова вялікі апарат. Пры Прэзідыуме Вярхоўнага Савета дзейнічае Інстытут дзяржаўнага будаўніцтва і заканадаўства, які таксама можа актыўна ўдзельнічаць у падрыхтоўцы такіх актаў. Аднак такая работа ў Вярхоўным Савеце ў дастатковай меры яшчэ не наладжана.

Як негатыўны я хацеў бы прывесці прыклад з унясеннем апошніх змяненняў у падатковае заканадаўства. У снежні 1994 і студзені 1995 года Вярхоўны Савет па прапанове Прэзідэнта прыняў бюджэт на 1995 год і ўнёс адпаведныя змяненні ў падатковае заканадаўства. Я не хачу сказаць, што і рэспубліканскі бюджэт, і змяненні ў падатковае заканадаўства былі падрыхтаваны ў ідэальным варыянце, які не патрабуе карэкціроўкі. Аднак гэтыя змяненні былі збалансаваны, на падатковым заканадаўстве была пабудавана і даходная, і расходная часткі бюджэту.

У пачатку сакавіка 1995 года Вярхоўны Савет перагледзеў падатковае заканадаўства і змяніў даходную частку бюджэту без узгаднення з Кабінетам Міністраў і Прэзідэнтам.

Што ж, гэта права Вярхоўнага Савета. Аднак Вярхоўны Савет павінен з усёй адказнасцю ўсведамляць, што ён не зменшыў расходную частку бюджэту і, больш таго, у апошні час прыняў шэраг заканадаўчых актаў, якія павялічваюць гэтую частку бюджэту. Аб гэтых актах Вярхоўнага Савета я ўжо гаварыў. Узнікае чыста рытарычнае пытанне: адкуль ураду ўзяць на гэта сродкі? Такога адказу Вярхоўны Савет пакуль што не дае. І я як Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь вымушаны заявіць, што заканадаўчая ўлада не зможа рэалізаваць гэтыя законы з-за адсутнасці на гэта сродкаў.

3. Трэцім галоўным напрамкам у сумеснай дзейнасці Вярхоўнага Савета і Прэзідэнта з'яўляецца рэалізацыя канстытуцыйнага механізма іх узаемаадносін у галіне знешняй палітыкі. Як вы ведаеце, у адпаведнасці з Канстытуцыяй Вярхоўны Савет вызначае асноўныя напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі, ратыфікуе і дэнансуе міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь, а Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь рэалізуе гэтыя асноўныя напрамкі, прадстаўляе дзяржаву ў адносінах з іншымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі, вядзе перагаворы і падпісвае міжнародныя дагаворы, мае і іншыя паўнамоцтвы ва ўказанай галіне.

Рэалізуючы свае паўнамоцтвы ў галіне знешняй палітыкі, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь зыходзіў з наступных задач:

п а - п е р ш а е, неабходнасці ўсталявання Рэспублікі Беларусь у сучасным свеце ў якасці суверэннай і незалежнай дзяржавы;

п а - д р у г о е, фарміравання ўзаемавыгадных адносін з усімі краінамі СНД, развіцця з імі як шматбаковага, так і двухбаковага супрацоўніцтва пры ўмове паглыблення прыярытэтных адносін з Расіяй;

п а - т р э ц я е, зыходзячы з геапалітычнага становішча Рэспублікі Беларусь як цэнтральнаеўрапейскай дзяржавы, мы вырашалі пытанні ўстанаўлення і развіцця адносін з краінамі заходняга, цэнтральнага і ўсходнееўрапейскага рэгіёнаў, імкнучыся збалансаваць усходнія і заходнія інтарэсы нашай дзяржавы;

і п а - ч а ц в ё р т а е, стварэнне спрыяльных умоў для супрацоўніцтва з міждзяржаўнымі і міжнароднымі арганізацыямі, такімі як ЕС, Міжнародным валютным фондам, Сусветным банкам, Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця.

У апошні час было падпісана нямала шматбаковых і двухбаковых пагадненняў з краінамі СНД, ЕС, Кітаем, Літоўскай Рэспублікай, Бельгіяй, Іранам, Вялікабрытаніяй. Сярод іх, паважаныя дэпутаты Вярхоўнага Савета, я хацеў бы вылучыць нашы дагаворанасці з Расіяй. Як вы ведаеце, мною падпісаны буйнамаштабны Дагавор аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй. Гэты дагавор дазваляе прынцыпова змяніць адносіны дзяржаў СНД і пачаць інтэграцыйны працэс, які падтрымліваюць пераважная большасць народаў Садружнасці. Умацаванне нашых адносін з Расіяй па шляху ўзаемнага эканамічнага пранікнення для Беларусі з'яўляецца асноватворным фактарам выхаду з крызісу і стабілізацыі многіх аспектаў унутранага жыцця рэспублікі. Я маю на ўвазе палітыка-эканамічны, сацыяльны, гісторыка-культурны і асабліва духоўна-маральны аспект, непасрэдна звязаны са святкаваннем 50-годдзя Вялікай Перамогі і аднаўлення гістарычнай супольнасці славянскіх народаў. Адмаўляць глыбіннае сэнсавае значэнне гэтага дагавора азначае непавагу да таго гістарычнага мінулага і цяперашняга, чым жылі, жывуць і будуць жыць брацкія беларускі і рускі народы.

З Расіяй у апошні час падпісана нямала пагадненняў і па іншых пытаннях. Аднак пасля іх падпісання мы сутыкнуліся з даволі жорсткай крытыкай асобных пагадненняў з боку нацыяналістычнага крыла палітычных сіл, і перш за ўсё з боку апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце. Гэта датычыць пагадненняў аб мытным саюзе, аб асноўных прынцыпах стварэння беларуска-расійскіх фінансава-прамысловых груп, аб парадку завяршэння будаўніцтва, выкарыстання і ўтрымання вузла Баранавічы сістэмы папярэджання аб ракетным нападзе і аб парадку выкарыстання радыёстанцыі "Вілейка". Я думаю, што многія дэпутаты разумеюць, што апазіцыя БНФ выкарыстоўвае гэты фактар для таго, каб любой цаной сарваць дагавор і не дапусціць умацавання адносін Беларусі і Расіі.

Я не буду цяпер падрабязна спыняцца на змесце ўказаных пагадненняў, з якімі вы маеце магчымасць азнаёміцца. Разам з тым хачу падкрэсліць, што падпісаныя з Расійскай Федэрацыяй пагадненні — гэта перш за ўсё пагадненні паміж суверэннымі дзяржавамі, раўнапраўнымі суб'ектамі міжнароднага права. Якога-небудзь ушчамлення інтарэсаў Рэспублікі Беларусь тут няма. Больш таго, як вы ведаеце, у мэтах рэалізацыі ўказаных пагадненняў Расія прыняла рашэнне аб выдзяленні нам 150-мільярднага крэдыту на льготных умовах. Вырашаны пытанні аб пастаўцы ў рэспубліку нафты і прыроднага газу па льготных, прымальных для нас цэнах, якія значна ніжэйшыя, чым цэны для іншых дзяржаў Садружнасці.

Мы лічым, што ўрад мае права заключаць указаныя пагадненні з Расійскай Федэрацыяй, гэта ўваходзіць у пытанні яго кампетэнцыі і парушэння Канстытуцыі тут няма.

4. Хацеў бы спыніцца яшчэ на адным блоку праблем адносін Вярхоўнага Савета і Прэзідэнта, які звязаны з забеспячэннем стабільнасці ў грамадстве, гарантыях бесканфліктнага развіцця палітычнага жыцця ў рэспубліцы. Бадай, гэта самае галоўнае, у чым мы разам павінны быць адказныя перад кожным грамадзянінам Беларусі.

У сувязі з гэтым негатыўныя адносіны Вярхоўнага Савета да многіх прапаноў Прэзідэнта безумоўна з'яўляюцца дэстабілізуючым фактарам. Дастаткова сказаць, што большасць пярэчанняў Прэзідэнта па ўжо прынятых Вярхоўным Саветам законах адхіляецца, прычым нават у тых выпадках, дзе размова ідзе аб неадпаведнасці прынятых законаў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Тут, я думаю, павінен выказацца і Канстытуцыйны суд, паколькі насельніцтва рэспублікі абгрунтавана патрабуе канкрэтных дзеянняў, а Прэзідэнт звязаны неканстытуцыйнымі законамі, пастановамі Вярхоўнага Савета, якія атрымалі статус законаў.

Хацеў бы засяродзіць вашу ўвагу яшчэ на дзвюх праблемах, звязаных з пытаннямі стабільнасці ў нашай дзяржаве. Гэта пытанні правядзення выбараў у Вярхоўны Савет, мясцовыя Саветы дэпутатаў і пытанне, звязанае з правядзеннем рэспубліканскага рэферэндуму.

Перш за ўсё хачу звярнуць увагу Вярхоўнага Савета на наступнае. У пункце 1 пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 23 лютага 1994 года "Аб арганізацыі і правядзенні выбараў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання" выбары новага саставу парламента назначаны на 14 мая 1995 года. Я ўжо ўказваў на тое, што Вярхоўным Саветам і яго Прэзідыумам прымаліся заявы аб правядзенні датэрміновых выбараў. Гэтыя заявы так і засталіся заклікамі, якія Вярхоўны Савет не збіраўся рэалізоўваць. Але я хацеў бы цяпер звярнуць вашу ўвагу не на маральны, а на юрыдычны бок гэтага пытання. Як вы ведаеце, артыкул 79 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1978 года ўстанавіў пяцігадовы тэрмін паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета. У гэтым жа артыкуле вызначалася, што выбары народных дэпутатаў назначаюцца не пазней чым за тры месяцы да заканчэння паўнамоцтваў адпаведных органаў дзяржаўнай улады. Такі ж тэрмін паўнамоцтваў устаноўлены і артыкулам 81 Канстытуцыі 1994 года. Прычым ні Канстытуцыя 1978 года, ні Канстытуцыя 1994 года не прадугледжвалі магчымасць прадаўжэння Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь сваіх паўнамоцтваў. У артыкуле 3 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб статусе народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь" устаноўлена, што паўнамоцтвы народнага дэпутата пачынаюцца з дня яго выбрання і заканчваюцца ў дзень выбрання народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь новага склікання. Такім чынам, вашы паўнамоцтвы, паважаныя дэпутаты Вярхоўнага Савета, пачаліся з моманту вашага выбрання ў сакавіку (а для некага ў красавіку, маі) 1990 года. Дарэчы, павінен заўважыць, што выбары дэпутатаў Вярхоўнага Савета папярэдніх скліканняў (гэта і 1980, 1985, 1990 гады) назначаліся ў лютым-сакавіку.

Калі зыходзіць з 5-гадовага тэрміну паўнамоцтваў дэпутатаў, то выбары ў Вярхоўны Савет трынаццатага склікання павінны былі быць назначаны на сакавік 1995 года. Мне цалкам зразумела жаданне дэпутатаў прадоўжыць тэрмін сваіх паўнамоцтваў. Аднак, як Прэзідэнт і гарант Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, заяўляю, што ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 100 Канстытуцыі мною будуць прыняты меры па забеспячэнню палітычнай і эканамічнай стабільнасці ў грамадстве. Таму заклікаю вас, паважаныя дэпутаты, мае былыя калегі, прыміце адпаведныя рашэнні аб складанні дэпутацкіх паўнамоцтваў самастойна.

З вашага боку Прэзідэнт і народ Беларусі чакаюць яшчэ больш узважанага і высокамаральнага ўчынку — гэта добраахвотнага складання сваіх паўнамоцтваў у бліжэйшы час. Я перакананы, што такі крок быў бы высока ацэнены ў грамадстве і садзейнічаў бы аднаўленню рэпутацыі Вярхоўнага Савета як вышэйшага заканадаўчага органа. Гэта вельмі важна ўлічваць для выбрання новага саставу Вярхоўнага Савета. Як вы разумееце, пасля складання вамі паўнамоцтваў жыццё не спыніцца і вельмі важна, які патэнцыял свайго аўтарытэту вы перададзіце сваім пераемнікам. У канкрэтным плане было б мэтазгодна на працягу гэтага тыдня па-дзяржаўнаму разгледзець беларуска-расійскі дагавор. Ратыфікаваць яго, падвесці вынікі больш чым пяцігадовага тэрміну сваёй работы, прыняць неабходныя рэспубліцы рашэнні і з пачуццём выкананага абавязку завяршыць дзейнасць Вярхоўнага Савета. Я ведаю, што шэраг дэпутатаў хвалюе матэрыяльны бок, звязаны з завяршэннем сваіх паўнамоцтваў. Думаю, што тут не можа быць ніякіх сумненняў у тым, што кожны з дэпутатаў атрымае прадугледжаныя дапамогі, а тыя з іх, хто падтрымлівае курс дзяржавы, гатоў выкарыстоўваць свой вопыт на карысць грамадства, будуць працаўладкаваны рашэннямі Прэзідэнта і Кабінета Міністраў. Як Прэзідэнту мне не хацелася б прымаць дадатковыя меры, аж да ўказа аб прыпыненні дзейнасці Вярхоўнага Савета ў выпадку, калі сярод паважаных дэпутатаў асабістае возьме верх над дзяржаўным, калі неабдуманыя і неабгрунтаваныя амбіцыі некаторых з іх будуць пераводзіць адносіны Вярхоўнага Савета і Прэзідэнта з канстытуцыйнага поля ў сферу адкрытай канфрантацыі.

Дарэчы, не магу не сказаць яшчэ аб адным парушэнні Канстытуцыі, звязаным ужо з выбарамі ў мясцовыя Саветы.

На падставе артыкула 79 Канстытуцыі 1978 года мясцовыя Саветы дэпутатаў былі выбраны 4 сакавіка 1990 года тэрмінам на 5 гадоў. Аднак артыкул 118 Канстытуцыі 1994 года і артыкул 6 Закона "Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь" вызначылі чатырохгадовы тэрмін паўнамоцтваў мясцовых Саветаў. Артыкул 3 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб парадку ўступлення ў сілу Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь" прадугледжвае, што дзеянне артыкулаў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1978 года спыняецца ў дзень уступлення ў сілу Канстытуцыі 1994 года, калі іншае не прадугледжана гэтым законам. Дарэчы, указаны закон не прадугледзеў магчымасці прадаўжэння паўнамоцтваў мясцовых Саветаў. Не было прынята наконт гэтага дадатковага рашэння Вярхоўнага Савета. Замест гэтага Вярхоўны Савет у сваёй пастанове назначыў дату выбараў у мясцовыя Саветы на 11 чэрвеня 1995 года і тым самым не толькі парушыў артыкул 118 Канстытуцыі, але і паставіў у няёмкае становішча многіх дэпутатаў мясцовых Саветаў.

Як бачыце, паважаныя дэпутаты, негатыўных момантаў у адносінах Вярхоўнага Савета і Прэзідэнта набралася даволі шмат. У большай меры яны ініцыіраваны Вярхоўным Саветам і падштурхоўваюць Прэзідэнта на прымяненне 100-га артыкула Канстытуцыі, калі не будзе знойдзены больш разважны спосаб аднаўлення канстытуцыйнага балансу галін улады.

На жаль, мне ўжо прыйшлося прымяніць свае паўнамоцтвы, прадугледжаныя гэтым артыкулам Канстытуцыі, адносна вызвалення ад пасады галоўнага рэдактара "Народнай газеты" дэпутата Сярэдзіча І.П. Я не сумняваюся, што вакол гэтага інцыдэнту Беларускі народны фронт, які працяглы час абслугоўвала "Народная газета", паспрабуе разыграць чарговую палітычную карту накшталт даклада Антончыка аб так званай карупцыі ў акружэнні Прэзідэнта. Справа, па сутнасці, не толькі ў чарговым падбухторшчыцкім артыкуле неўстаноўленага аўтара, які адкрыта заклікаў да крыві, насілля, грамадзянскага процістаяння ў грамадстве. Карэннае пытанне — у сумленнай, канструктыўнай пазіцыі дзяржаўнага выдання Вярхоўнага Савета, якім з'яўляецца "Народная газета". Такой пазіцыі ў газеты няма. Яна ператварылася ў газету адной партыі, аднаго чалавека, парушыўшы афіцыйны статус дзяржаўнага выдання, і выйшла, такім чынам, з-пад кантролю Вярхоўнага Савета. Газета свядома адышла ад выканання асноўных прафесійных прынцыпаў журналістыкі, звязаных з прадастаўленнем роўных магчымасцей для ўсіх аўтараў, партый і грамадска-палітычных рухаў. Унутраная дзейнасць газеты будавалася на жорсткай цэнзуры і селекцыі палітычных поглядаў. Менавіта таму дамінуючымі тэмамі газеты былі прапаганда нацыяналізму і русафобіі, дыскрэдытацыя палітыкі і эканамічнага курсу дзяржавы і яе службовых асоб. Прымаючы пад увагу, што Вярхоўны Савет тройчы разглядаў пытанне аб даверы галоўнаму рэдактару і ў апошні раз устрымаўся ад канчатковага вываду, радыкальнае рашэнне прыйшлося прымаць Прэзідэнту. Я перакананы, што дэпутаты, якія разумеюць і дарожаць стабільнасцю ў грамадстве, падтрымаюць гэту неардынарную, але выключна важную меру. Хацеў бы спадзявацца, што з інцыдэнту з "Народнай газетай" сур'ёзныя вывады зробяць і іншыя сродкі масавай інфармацыі рэспублікі. Са свайго боку, я заяўляю, што не дапушчу разгулу паклёпу, шальмавання, інтрыганства на тэлебачанні, радыё і ў друку, як бы дорага не аплачваліся гэтыя брудныя акцыі зацікаўленымі кругамі.

Праблема маральнасці ў сродках масавай інфармацыі заслугоўвае пільнай увагі дзяржавы і грамадскасці яшчэ і таму, што маюць адбыцца выбары ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь. Паводле папярэдніх даных, чакаецца вылучэнне ў кожнай акрузе ў сярэднім да 15—25 кандыдатаў. Агульная іх колькасць, відаць, перавысіць 3—3,5 тысячы, а можа, і больш. У такіх умовах вельмі складана забяспечыць роўныя магчымасці кандыдатаў у выкарыстанні сродкаў масавай інфармацыі. У гэтай сувязі я падпісаў указ, які рэгламентуе забеспячэнне роўных магчымасцей кандыдатаў у дэпутаты з улікам выкарыстання мясцовага радыёвяшчання і мясцовага друку выключна ў тых выбарчых акругах, дзе яны балаціруюцца. Як Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь і кіраўнік дзяржавы, я не павінен аддаваць перавагі канкрэтным палітычным партыям і кандыдатам у дэпутаты ў гэтай выбарчай кампаніі. Аднак забяспечыць для іх роўныя магчымасці пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў я проста абавязаны.

І апошняе. Да мяне звяртаюцца грамадзяне Рэспублікі Беларусь, многія дэпутаты Вярхоўнага Савета з прапановамі аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму. Сапраўды, ёсць шэраг пытанняў, па якіх хацелася б выслухаць думку народа Рэспублікі Беларусь. Мы абмяркоўвалі гэтыя пытанні і выдзелілі сярод іх некалькі найбольш важных. Размова ідзе перш за ўсё аб статусе рускай мовы ў Рэспубліцы Беларусь, дзяржаўнай сімволіцы, устанаўленні больш цесных эканамічных сувязей з Расійскай Федэрацыяй і аб прадастаўленні аднолькавых паўнамоцтваў Прэзідэнту, якімі валодае Вярхоўны Савет. Таму я выкарыстаў сваё канстытуцыйнае права і, у адпаведнасці з артыкулам 74 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, уношу прапанову аб назначэнні на 14 мая, адначасова з правядзеннем выбараў у Вярхоўны Савет, рэспубліканскага рэферэндуму. Адначасовае правядзенне і выбараў, і рэферэндуму, безумоўна, дазволіць скараціць расходы на гэтыя дзве буйныя грамадска-палітычныя кампаніі. Пытанні, выносімыя на рэферэндум, мною будуць прапанаваны ў бліжэйшы час. Лічу, што Вярхоўны Савет павінен падтрымаць гэтыя прапановы Прэзідэнта, шырокай грамадскасці рэспублікі і правесці рэспубліканскі рэферэндум. Гэта думка не столькі Прэзідэнта, колькі народа Беларусі, які 10 ліпеня мінулага года прагаласаваў за праграму Лукашэнкі, у якой гаварылася аб неабходнасці правядзення рэферэндуму як асноўнага фактару дасягнення стабільнасці ў нашым грамадстве.

Паважаныя дэпутаты Вярхоўнага Савета! За мінулыя пяць гадоў нашай сумеснай работы нам разам прыйшлося вырашаць вельмі складаныя пытанні будаўніцтва беларускай дзяржаўнасці. Гісторыя, і, відаць, толькі яна мае на гэта права, рассудзіць, як будаваўся будынак нашай дзяржавы — Рэспублікі Белзрусь. Ваш тэрмін паўнамоцтваў заканчваецца, але гэта не азначае, што жыццё спыняецца. Наадварот, яно набывае свае развіццё ў новых умовах, калі патрэбны энергічныя дзеянні, канкрэтныя практычныя крокі па вывяду Беларусі з крызісу і паляпшэнню жыцця народа.

Я шчыра дзякую вам за работу і спадзяюся, што ваш багаты вопыт парламенцкай дзейнасці ў гэты складаны перыяд будзе садзейнічаць забеспячэнню стабільнасці і згоды ў нашым грамадстве. Я гатоў дапамагаць усім без выключэння дэпутатам, якія падтрымліваюць курс Прэзідэнта і гатовы сумленна працаваць на карысць нашага народа. Я перакананы, што мы павінны расстацца не ворагамі, а аднадумцамі, паколькі дарагі час, на працягу якога трэба вырашыць галоўнае пытанне — гэта забяспечыць дастойнае жыццё кожнаму грамадзяніну Рэспублікі Беларусь.

Дзякуй за ўвагу.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

КАК ЭТО ДЕЛАЛОСЬ

Без указания причин смерти

Игорь КУЗНЕЦОВ, кандидат исторических наук, доцент

О массовых репрессиях 20—50-х годов написано немало. Особый интерес к этим трагическим страницам истории объясняется прежде всего стремлением разоблачить тоталитаризм в прошлом и настоящем, не допустить его повторения. Приоткрылись архивы, постепенно увеличивается список работ по этой проблеме, и все больше появляется искушение заявить: "Все ясно!", "Все известно!".

Но это далеко не так... В частности, до сегодняшнего дня мы практически ничего не знаем о фальсификации в государственном масштабе истинных причин и дат смерти наших сограждан, безжалостно уничтоженных в те кровавые годы. О судьбах арестованных лгали всегда. Это знает каждый, кто прошел очереди к справочным окошечкам — прокуратуры, милицейским, гулаговским. Твой близкий находился в одной тюрьме, а тебе называли другую, его увозили на Восток, а говорили, что на Север, или вовсе отговаривались незнанием ("сведениями о местопребывании не располагаем"), лгали о причинах ареста и осуждения, лгали о состоянии здоровья. И особая ложь — о причинах смерти: "сердечная недостаточность", "воспаление легких", но никогда не голод, не туберкулез, не самоубийство, не расстрел.

Правда раскрывалась малыми толиками, в основном начиная с середины 50-х годов. Однако была категория жертв репрессий, о судьбе которых продолжали сознательно лгать и в пору первой реабилитации, и при "застое", и в разгар перестройки. Под запретом во все эти эпохи оставалась правда о судьбах тех, кто был расстрелян по приговорам несудебных органов — "особых троек", "двоек", Комиссии НКВД и Прокурора СССР и т.д.

Самый ранний из известных нам приказов НКВД по этому вопросу относится к 1939 году. Приказ предписывал на запросы родственников о судьбе того или иного расстрелянного отвечать, что он был осужден на 10 лет исправительно-трудовых лагерей без права переписки и передач. Осенью 1945 года приказ был скорректирован — заявителям стали теперь говорить, что их родственники умерли в местах лишения свободы.

Шли годы, вопросы вокруг судеб расстрелянных накапливались и заставляли и МГБ, и Министерство юстиции, и Прокуратуру обращаться в "инстанции" (т.е. в ЦК КПСС) с просьбой вынести решение по всем аспектам проблемы: что отвечать устно, какие ответы можно давать письменно, как и где регистрировать смерть, как заполнять в свидетельстве о смерти сведения о дате, причине, месте ее, выдавать ли какие-либо документы, связанные с имущественными проблемами и т.п.

На заседании Президиума ЦК КПСС 18 августа 1955 г., где разбирался этот вопрос, было вынесено постановление, на основании которого через неделю тогдашний председатель КГБ СССР И.Серов издал развернутое указание. Предписывалось, как и раньше, сообщать относительно расстрелянных, что они были приговорены к 10 годам ИТЛ и умерли во время отбывания наказания.

В необходимых случаях (если это требовалось для решения имущественных или правовых вопросов) предписывалось регистрировать смерть в органах ЗАГС по месту жительства осужденного до ареста и выдавать свидетельство о смерти. При этом дата смерти определялась КГБ произвольно в пределах 10 лет со дня ареста, вымышленной была и причина смерти, а в качестве места указывалось место жительства осужденного до ареста.

Что касается расстрелянных по приговорам Военной коллегии Верховного суда СССР, то здесь указания ЗАГСам должны были давать не органы КГБ, а сама Военная коллегия. По существовавшему в те годы в Военной колегии порядку родственникам осужденных к высшей мере сообщалось не о расстреле, а о выдуманной дате и причине смерти их родных и близких.

Работники советских и партийных органов, разбирая заявления родственников осужденных к высшей мере, сообщали им о расстреле. Военная коллегия настаивала на том, что осужденные умерли в местах лишения свободы.

Органы НКВД—МГБ—КГБ сообщали родственникам осужденных к расстрелу, что последние будто бы осуждены на 10 лет лишения свободы в отдаленных местностях Крайнего Севера без права переписки. Военная коллегия на этом основании давала вымышленную дату смерти. Между днем осуждения и этой датой образовывался разрыв в 5—6 лет.

Несмотря на то, что в Военную коллегию в период 1953—1959 годов резко увеличилось количество обращений общественных организаций, учреждений и отдельных лиц со списками граждан, которые имели в прошлом большие заслуги перед государством, с просьбой сообщить, реабилитированы ли они и какова их судьба, коллегия продолжала сообщать вымышленные даты смерти. В результате этого вымышленные даты стали появляться в официальных документах и свидетельствах о смерти, органы ЗАГС по указанию КГБ продолжали выдавать родственникам липовые свидетельства о смерти. Такие "свидетельства" получили сотни тысяч наших сограждан.

Установление в 1955 году указанного "порядка" мотивировалось тем, что в период массовых репрессий было необоснованно осуждено большое количество граждан и поэтому сообщение о действительной судьбе репрессированных могло отрицательно влиять на положение их семей. Кроме того, предполагалось, что сообщение членам семей расстрелянных о действительной судьбе их родственников якобы могло быть "использовано враждебными элементами в ущерб интересам советского государства".

Существовавший порядок сообщения вымышленных данных касался в основном невинно пострадавших советских граждан, которые были расстреляны по решениям несудебных органов (Коллегией ОГПУ, "тройками" ОГПУ—НКВД—УНКВД и Комиссией НКВД СССР и Прокурора СССР, а также Особым совещанием при НКВД—МГБ—МВД СССР) в период массовых репрессий.

В результате пересмотра архивно-следственных дел с 1954 по 1961 год из общего количества расстрелянных в несудебном порядке было реабилитировано около 60 процентов осужденных. В отношении их родственникам были объявлены ложные сведения о смерти, якобы наступившей в местах лишения свободы.

И только в декабре 1962 года в недрах КГБ вызрело предложение о необходимости отмены существовавшего порядка рассмотрения заявлений граждан с запросами о судьбе их родственников. Но это было вызвано отнюдь не гуманными соображениями. Оказывается, сообщение гражданам вымышленных дат и обстоятельств смерти близких их родственников ставило органы госбезопасности в ложное положение, особенно при опубликовании в печати дат смерти лиц, имевших в прошлом заслуги перед партией и государством.

Кроме того, регистрация смерти расстрелянных граждан по решениям несудебных органов с указанием в документах вымышленных сроков их пребывания в местах заключения ставило членов их семей в неравные условия с членами семей лиц, расстрелянных по суду.

В связи с этим по предложению председателя КГБ СССР В.Семичастного и с одобрения Политбюро ЦК КПСС с 1963 года на запросы граждан о судьбе их родственников, приговоренных в несудебном порядке к расстрелу, устно стали сообщать действительные обстоятельства смерти этих лиц, а регистрацию в ЗАГСах их смерти производили датой расстрела без указания причин смерти, как это делали Военная коллегия Верховного суда СССР и военные трибуналы в отношении лиц, расстрелянных по приговорам судов.

Уведомление граждан о действительной причине смерти осужденных лиц стало давать членам их семей, имевших право на пенсионное обеспечение по случаю потери кормильца, основание для возбуждения ходатайства о назначении пенсий на льготных основаниях как родственникам лиц, умерших от трудового увечья или погибших при исполнении служебных обязанностей. Конечно, это можно было бы считать серьезным шагом по пути к исторической правде, если бы не одно обстоятельство: тем, кому ранее давались лживые ответы (в соответствии с указаниями 1955 г.), продолжали лгать по-прежнему. Не изменен был порядок и относительно сведений, сообщаемых за границу, — здесь, как и прежде, предлагалось руководствоваться соображениями практической целесообразности в каждом отдельном случае.

